Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
___________ Н. У. Карчэўская
«_____»_____________2018 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

*Праграма дзяржаўнага экзамену*
*па спецыяльнасці 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

2018

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*Л. І. Казлоўская,* загадчык кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*Т. П. Бірукова,* дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*В. В. Савіна,* дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*А. В. Рабава,* дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук;
*Н. І. Гуд,* старшы выкладчык кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;
*А. П. Байко,* старшы выкладчык кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;
*А. А. Корбут,* дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук;
*В. У. Рагачова,* дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук;
*Н. У. Самерсава,* прафесар кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук
**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*С. А. Валахановіч,* начальнік упраўлення ідэалагічнай і выхаваўчай работы Акадэміі ўпраўлення пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*С. Б. Майсяйчук,* прафесар кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт
**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 17.03.2017);
*саветам* факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 29.03.2017);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 19.10.2017)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Л. І. Казлоўская

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дзяржаўны экзамен «Сацыяльна-культурная дзейнасць» з'яўляецца комплексным, міждысцыплінарным выпрабаваннем, якое павінна выявіць тэарэтычную падрыхтоўку выпускніка да рашэння прафесійных задач.

Экзамен выяўляе веды па асноўных дысцыплінах агульна-прафесійнай і спецыяльнай падрыхтоўкі спецыяліста, а таксама дысцыплінах спецыялізацыі, якія прадугледжаны адукацыйным стандартам па спецыяльнасці 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць.

У сувязі з гэтым у праграму дзяржаўнага экзамену ўключаны пытанні па вучэбных дысцыплінах «Сацыяльна-культурная дзейнасць», «Сацыяльна-культурнае праектаванне», а таксама «Тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці».

*Мэта дзяржаўнага экзамену* «Сацыяльна-культурная дзейнасць: гісторыя, тэорыя, тэхналогіі» – выявіць ступень адпаведнасці выпускніка дзяржаўным патрабаванням да адукаванасці спецыяліста сацыяльна-культурнай дзейнасці.

*Задачы дзяржаўнага экзамену:*

– ведаць асноўныя этапы гісторыі сацыяльна-культурнай дзейнасці і іх значэнне для распрацоўкі сучасных мадэляў выхаваўчай работы ў сацыяльна-культурнай сферы;

– ведаць тэарэтычныя асновы, катэгорыі і паняцці сацыяльна-культурнай дзейнасці, асноўныя навуковыя школы ў тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– ведаць базавыя сацыякультурныя тэхналагічныя сістэмы (культуратворчыя, рэкрэацыйныя, відовішчныя, гульнявыя, інфармацыйныя, асветніцкія, камунікатыўныя і інш.);

– ведаць асноўныя этапы станаўлення і развіцця культурнай палітыкі ў Беларусі, разумець культурную палітыку як аснову стратэгіі сацыякультурнага кіравання;

– ведаць асновы эканомікі, менеджменту і маркетынгу ў сферы сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– ведаць асаблівасці рэалізацыі тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці ў адпаведнасці з сацыяльна-дэмаграфічнымі, узроставымі і іншымі асаблівасцямі суб'ектаў сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– ведаць асновы праектавання і рэалізацыі сацыякультурных тэхналогій ва ўстановах рознага тыпу.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам спецыяліст сацыякультурнай сферы павінен быць падрыхтаваны да розных відаў дзейнасці, якія суадносяцца з акадэмічнымі, сацыяльна-асобаснымі і прафесійнымі кампетэнцыямі.

*Акадэмічныя кампетэнцыі* праяўляюцца ва ўменні працаваць самастойна, быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю), валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі. Патрабаванні да *сацыяльна-асобасных кампетэнцый* прадугледжваюць здольнасць да сацыяльнага ўзаемадзеяння, здольнасць да крытыкі і самакрытыкі. *Прафесійныя кампетэнцыі* праяўляюцца ў здольнасці рэалізоўваць агульнадзяржаўныя, рэгіянальныя і ведамасныя праграмы і праекты ў галіне культуры і мастацтваў, арганізоўваць і ажыццяўляць пазнавальную і творчую дзейнасць розных сацыяльных і ўзроставых груп насельніцтва ва ўстановах сферы культуры і ў пазашкольных установах, арганізоўваць інфармацыйна-асветніцкую і выхаваўчую работу па месцы жыхарства, набываць новыя веды, выкарыстоўваючы сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі. Ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сферы культуры і мастацтваў, прагназаваць, планаваць і арганізоўваць інавацыйна-метадычную і мастацка-творчую дзейнасць у сферы культуры і мастацтваў, выяўляць інтарэсы і педагагічныя патрэбнасці насельніцтва ў розных відах вольнага часу.

Гэтыя патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі выпускніка, якія выяўляюцца на дзяржаўным экзамене па спецыяльнасці 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць, носяць агульны характар і дапаўняюцца пытаннямі па адпаведнай кваліфікацыі і спецыялізацыі.

Дзяржаўны экзамен праводзіцца ў пісьмова-вуснай форме і прадугледжвае падрыхтоўку разгорнутага адказу на два тэарэтычных пытанні па асноўных раздзелах навучальных дысцыплін, вынесеных на экзамен.

Пры адказе на дзяржаўным экзамене выпускнік павінен прадэманстраваць добрае валоданне прафесійнай лексікай, самастойнасць мыслення, уменне аргументаваць уласныя меркаванні і прафесійную пазіцыю, уменне выкарыстоўваць базавыя веды для вырашэння задач.

Узровень падрыхтоўкі ацэньвае дзяржаўная экзаменацыйная камісія.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЗЯРЖАЎНАГА ЭКЗАМЕНУ

### 1. Развіццё сацыяльна-культурных ініцыятыў у Вялікім Княстве Літоўскім (XIII–XVI стст.)

Храмы і манастыры як цэнтры развіцця беларускай культуры. Кірмаш як разнавіднасць гуляння і народнага свята. Творчасць скамарохаў у тэатральна-гульнявых дзеяннях. Смаргонская акадэмія скамарохаў і асноўныя кірункі яе дзейнасці. Народныя драмы і тэатральныя ігрышчы. Саслоўныя формы баўлення вольнага часу. Княжацкія маёнткі як першыя цэнтры развіцця музычнай і тэатральнай культуры. Зараджэнне кнігадрукавання ў Беларусі. Асветніцкая і выдавецкая дзейнасць Ф. Скарыны.

### 2. Асаблівасці развіцця сацыяльна-культурнай дзейнасці на беларускіх землях у час уваходжання іх у склад Расійскай імперыі (XVIII – пач. XX ст.)

Вячоркі ў Беларусі. Народныя гулянні. Беларуская карчма як правобраз вясковага клуба. Кірмашы, святы і абрады ў жыцці беларускай вёскі. Аматарскія аб'яднанні другой паловы XIX ст. (літаратурныя, музычныя, драматычныя таварыствы). Дзейнасць народных дамоў, народных універсітэтаў, школ выхаднога дня, публічных бібліятэк і інш. Дабрачынныя і добраахвотныя таварыствы, саслоўныя і саслоўна-прафесійныя клубы. Грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць «беларускіх хатак».

### 3. Сацыяльна-культурная дзейнасць у кантэксце рэвалюцыйных падзей у пачатку XX ст.

Праграма нацыянальна-культурнага адраджэння. Першыя дэкрэты Савецкай улады аб нацыяналізацыі музеяў, тэатраў, бібліятэк, клубаў, народных дамоў і інш. Арганізацыя культурна-асветніцкай работы. Стварэнне сеткі дзяржаўных культурна-асветных устаноў. Дзейнасць Наркамата асветы. Палітычнае асветніцтва ў дзейнасці грамадскіх арганізацый (Пралеткульт, прафсаюз, РАПМ, Галоўпалітасвет і інш.). Палітычная вучоба, барацьба з непісьменнасцю, арганізацыя дзейнасці ў вольны час (мастацкія гурткі, музычныя школы, самадзейныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэатры). Роля хат-чытальняў у развіцці культурных традыцый беларускай вёскі. Уклад беларускіх навукоўцаў у распрацоўку пытанняў гісторыі сацыяльна-культурнай дзейнасці ў пачатку XX ст.

### 4. Паняцце «сацыякультурная дзейнасць», яе магчымасці ў духоўным развіцці асобы

Паняційны апарат прадмета. Прадмет і аб'ект СКД. Сутнасць паняцця «сацыяльна-культурная дзейнасць». Вядучыя рысы СКД: гуманістычны, культуралагічны, развіваючы характар, свабода выбару культурных заняткаў, добраахвотнасць, актыўнасць, ініцыятыва. Этычная накіраванасць СКД.

### 5. Прынцыпы і функцыі сацыяльна-культурнай дзейнасці

Прынцыпы СКД: добраахвотнасць і агульнадаступнасць, развіццё ініцыятывы і самадзейнасці, комплекснасць выкарыстання культурастваральнага патэнцыялу прыроды і грамадства і інш. Уплыў працэсаў сацыяльна-эканамічнага і духоўнага абнаўлення грамадства на трансфармацыю прынцыпаў СКД.

Вызначэнне тэрміна «функцыя» ў суаднясенні з мэтамі і задачамі СКД. Вядучыя функцыі сацыяльна-культурнай дзейнасці і іх характарыстыка. Накіраванасць функцый сацыякультурнай дзейнасці на выхаванне, развіццё і самаразвіццё асобы, яе самарэалізацыю. Функцыя як своеасаблівы крытэрый ацэнкі сацыякультурных працэсаў, эфектыўнасці работы сацыякультурных інстытутаў і грамадскіх фарміраванняў.

### 6. Асноўныя напрамкі рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у сацыякультурнай сферы

Развіццё нацыянальнай культуры як важны кірунак «Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2020 г.» (падраздзел «Развіццё нацыянальнай культуры»). Азначэнне «культурная палітыка». Мноства суб'ектаў культурнай палітыкі. Арыенціры сучаснай культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Структура кіруючых органаў культуры ў Рэспубліцы Беларусь. Кірункі дзяржаўнага рэгулявання і кіравання ў галіне культуры ў адпаведнасці з арт. 12 Закона «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Віды і асноўныя тыпы арганізацый культуры, вызначаныя законам аб культуры (арт. 21). Галоўныя функцыі Міністэрства культуры. Мясцовыя органы кіравання культурай. Дзяржаўныя праграмы захавання і развіцця культуры Рэспублікі Беларусь.

## 7. Арганізацыя культурна-адпачынкавай дзейнасці розных катэгорый насельніцтва за мяжой

Паняцце «дасуг» і «рэкрэацыя» ў тэорыі і практыцы замежных краін. Асноўныя мадэлі дасуга. Дасуг як поле сацыяльнага выхавання.

Узаемасувязь сацыяльнай работы і культурна-адпачынкавай дзейнасці. Асноўныя напрамкі адпачынкава-забаўляльнай дзейнасці ў развітых краінах Захаду.

Спецыфіка дзейнасці паркаў па арганізацыі дасуга. Бібліятэкі як цэнтры сацыякультурнай дзейнасці асобы. Дзейнасць музеяў па развіцці інтэлектуальна-пазнавальнай сферы дзяцей і падлеткаў.

Анімацыйныя і арт-тэрапеўтычныя тэхналогіі ў вырашэнні сацыяльных і сацыякультурных праблем. Культурна-адпачынкавая работа на муніцыпальным узроўні.

## 8. Планаванне дзейнасці ўстаноў культуры

Паняцце «планаванне работы ўстаноў культуры». Віды планаў устаноў культуры. Перспектыўнае планаванне, яго сутнасць. Структура і змест гадавога плана. Бягучыя планы: квартальны, месячны (каляндарны) планы работы, план работы ўстаноў культуры на перыяд грамадска-палітычных кампаній.

Планы работы аматарскіх мастацкіх калектываў, клубаў па інтарэсах, рэпертуарныя планы гурткоў і калектываў мастацкай творчасці, планы падрыхтоўкі і правядзення культурна-адпачынкавых праграм.

## 9. Установы сацыяльна-культурнай сферы і іх роля ў арганізацыі вольнага часу насельніцтва

Клубныя структуры (дзяржаўныя клубныя ўстановы, грамадскія, камерцыйныя, прыватныя клубныя прадпрыемствы) як сацыяльна-культурныя інстытуты, Бібліятэкі як суб’екты СКД. Паркі культуры і адпачынку як суб’екты СКД. Асноўныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кірункі дзейнасці паркаў. Класіфікацыя паркаў па функцыянальным прызначэнні.

Сацыяльна-культурныя інстытуты музейнага тыпу, іх класіфікацыя і функцыянальнае прызначэнне. Кінатэатры як суб'екты СКД. Дамы рамёстваў і дамы фальклору: змест і кірункі дзейнасці.

Характарыстыка дзейнасці сацыяльна-культурных, культурна-спартыўных комплексаў і цэнтраў адпачынку. Класіфікацыя сацыяльна-культурных цэнтраў і комплексаў.

## 10. Суб'екты і аб'екты сацыяльна-культурнай дзейнасці

Сацыяльна-культурныя інстытуты, установы і арганізацыі як суб'екты сацыяльна-культурнай дзейнасці. Вядучыя сацыяльныя інстытуты і супольнасці – сям'я, мікрасоцыум, царква, дзяржаўныя і недзяржаўныя інстытуты, арганізацыі і аб'яднанні: навучальныя (адукацыйныя), сацыяльна-культурныя, вытворчыя, сацыяльна-ахоўныя, дабрачынныя, мастацка-творчыя, спартыўныя і інш. Іх адмысловае прызначэнне як суб'ектаў сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Аўдыторыя культурна-адпачынкавых інстытутаў, устаноў і арганізацый як аб'ект сацыяльна-культурнай дзейнасці. Сацыяльна-псіхалагічная і педагагічная тыпалагізацыя аб'екта сацыяльна-культурнай дзейнасці. Масавыя, групавыя і індывідуальныя аб'екты культурна-адпачынкавай дзейнасці. Дыферэнцыяцыя аб'екта культурна-адпачынкавай дзейнасці, улік інтарэсаў, запатрабаванняў, каштоўнасных арыентацый.

## 11. Арганізацыя і методыка сацыякультурнай дзейнасці з рознымі катэгорыямі насельніцтва

Дыферэнцыраваны падыход да арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці розных катэгорый насельніцтва.

Асаблівасці арганізацыі культурна-адпачынкавай дзейнасці з дзецьмі і падлеткамі. Педагагічныя задачы і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці дзяцей з дэвіянтнымі паводзінамі, сірот, інвалідаў і іншых катэгорый дзяцей і падлеткаў.

Арганізацыя вольнага часу моладзі ва ўстановах сацыяльна-культурнай сферы. Кіраванне і самакіраванне вольным часам моладзі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сацыякультурны статус і сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці людзей сярэдняга і пажылога ўзросту. Формы і метады сацыяльна-культурнай дзейнасці людзей сярэдняга і пажылога ўзросту.

## 12. Сутнасць культурна-адпачынкавай дзейнасці

Тэарэтычныя падыходы да вызначэння паняцця «культурна-адпачынкавая дзейнасць». Абгрунтаванне адпачынку як адной з вядучых сфер жыццядзейнасці чалавека. Характарыстыка адпачынку як часу, як дзейнасці, як стану чалавека. Структура адпачынку (спажыванне культурных каштоўнасцей, самаадукацыя, культурна-творчыя заняткі, гульня і інш.). Узроўні выкарыстання вольнага часу ў залежнасці ад матывацыі, актыўнасці, самастойнасці асобы.

## 13. Класіфікацыя форм культурна-адпачынкавай дзейнасці

Падставы і крытэрыі класіфікацыі форм культурна-адпачынкавай дзейнасці. Формы як спосаб арганізацыі людзей для сумеснай культурна-адпачынкавай дзейнасці (арганізацыйныя) і як спосаб арганізацыі ідэйна-эмацыянальнага матэрыялу (метадычныя). Арганізацыйныя формы: індывідуальныя (этычная гутарка, занятак у гуртку, студыі, выкананне даручэння і інш.), групавыя (гурткі, секцыі, клубы, аматарскія аб'яднанні, органы грамадскага самакіравання), калектыўныя (народныя мастацкія калектывы, узорныя дзіцячыя калектывы), масавыя (студыі, майстэрні, школы, курсы, лекторыі, народныя ўніверсітэты). Метадычныя формы: вусныя (лекцыі, даклады, гутаркі, дыспуты, канферэнцыі і г. д.), друкавана-наглядныя (выставы, вокны сатыры, газеты насценныя, Дошкі гонару і інш.), комплексныя (вусны часопіс, тэматычны вечар, свята, тэатральная дзея, культурна-адпачынкавая праграма).

## 14. Класіфікацыя форм і метадаў сацыяльна-педагагічнай работы

Розныя падыходы да класіфікацыі метадаў сацыяльна-педагагічнай работы. Сістэма агульных метадаў здзяйснення сацыяльна-педагагічнай дзейнасці. Класіфікацыя метадаў сацыяльна-педагагічнай работы на аснове функцый сацыяльна-педага-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гічнай дзейнасці: метады сацыяльна-педагагічнай дапамогі і падтрымкі; метады псіхолага-педагагічнай карэкцыі; метады сацыяльнай адаптацыі; метады сацыяльнай прафілактыкі; метады сацыяльна-педагагічнай рэабілітацыі; даследчыя метады.

Класіфікацыя метадаў сацыяльна-педагагічнай работы па характары сацыяльных роляў, якія выконвае спецыяліст па СКД (метады праваахоўнай дзейнасці, метады валанцёрскай работы, метады кансультатыўнай дзейнасці і г. д.).

Комплекснае выкарыстанне ўсіх груп метадаў арганізацыі сацыяльна-педагагічнай дзейнасці.

## 15. Методыка сацыяльна-культурнай дзейнасці ў агульнаадукацыйных школах і пазашкольных установах

Асноўныя напрамкі і формы сацыяльна-культурнай работы ў школе. Прафілактыка правапарушэнняў сярод вучняў. Сацыякультурная рэабілітацыя і адаптацыя дзяцей і падлеткаў з дэвіянтнымі паводзінамі.

Спецыфіка арганізацыі культурна-адпачынкавай дзейнасці ў шосты школьны дзень, у час канікул (школьны аздараўленчы лагер).

Работа з малазабяспечанымі і шматдзетнымі сем'ямі. Методыка прафарыентацыйнай работы са старшакласнікамі.

Структура і кірункі дзейнасці цэнтраў творчасці дзяцей і моладзі і каардынацыя іх дзейнасці. Асноўныя формы сучасных дзіцячых аб'яднанняў (студый, майстэрняў, ансамбляў) і іх характарыстыка.

## 16. Паняцце аб метадычным кіраўніцтве СКД

Прадмет, аб'ектыўныя і суб'ектыўныя фактары метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці. Сутнасць, асноўныя задачы і галоўныя рысы метадычнага забеспячэння. Месца і роля метадычнага кіраўніцтва ў сістэме кіравання сацыяльна-культурнай дзейнасцю. Арганізацыйная структура дзяржаўнай сістэмы метадычнага забеспячэння СКД у Рэспубліцы Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 17. Агульная характарыстыка сродкаў метадычнага кіраўніцтва і іх класіфікацыя

Сутнасць і спецыфіка выкарыстання асноўных сродкаў метадычнага забеспячэння СКД. Сродкі збору, накаплення і фіксацыі інфармацыі аб вопыце СКД. Сродкі захавання метадычнай інфармацыі. Сродкі апрацоўкі і аналізу інфармацыі аб вопыце СКД. Тэхнічныя сродкі метадычнага забеспячэння СКД у працэсе аптымізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Сродкі ўкаранення перадавога вопыту і навуковых даследаванняў СКД у практыку работы спецыялістаў. Асноўныя віды метадычных дакументаў і запатрабаванні да іх.

## 18. Эмпірычныя метады даследавання ў сацыяльна-культурнай дзейнасці

Агульная характарыстыка эмпірычных метадаў даследавання ў СКД. Метады вывучэння навуковай і метадычнай літаратуры, архіўных матэрыялаў. Этапы працы з кнігай. Бібліяграфічны пошук. Методыка апрацоўкі атрыманай інфармацыі, віды яе прадстаўлення (выпіска, цытата, табліца, дыяграма, графік). Назіранне як метад даследавання ў СКД. Апытанне як метад даследавання ў СКД. Выкарыстанне метаду тэстаў у СКД. Вывучэнне прадуктаў дзейнасці як метад даследавання ў СКД. Метад вывучэння дакументацыі. Метад экспертных адзнак. Метад эксперымента: сутнасць і асаблівасці выкарыстання ў СКД.

## 19. Мэты і функцыі менеджменту

Мэта кіравання як жаданыя паводзіны сістэмы, генеральны імператыў дзеянняў. Фарміраванне і замацаванне мэт (палітыка арганізацыі, місія, планы, юрыдычныя нарматыўныя дакументы). Патрабаванні да фармулёвак мэт і іх класіфікацыя. «Дрэва мэт». Паняцце і прыметы функцый. Функцыі: планавання (азначэнне будучыні тэндэнцый і перспектыў развіцця аб’екта кіравання); арганізацыі (стварэнне, развіццё і захаванне структуры прадпрыемства; дэлегіраванне паўнамоцтваў; рэгламентацыя); матывацыі (заахвочванне работніка да працоўнай дзейнасці, змястоўныя і працэсуальныя тэорыі); кантролю (забеспячэнне мэт арганізацыі; азначэнне якасці і карэкціроўка выкон-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваемых работ); каардынацыі (забеспячэнне адзінства і ўзгодненасці ўсіх стадый працэсу кіравання на ўсіх узроўнях іерархічнай структуры арганізацыі). Спецыфічныя функцыі кіравання: падзел на пэўныя бакі і сферы дзейнасці прадпрыемства, у якіх аднаўляюцца кіраўнічыя цыклы.

## 20. Кіраўнічыя рашэнні як вынік (прадукт) кіраўнічай работы

Кіраўнічае рашэнне – творчае, валявое дзеянне суб’екта кіравання. Прыняцце кіраўнічых рашэнняў як псіхалагічны працэс: на аснове інтуіцыі, меркаванняў, рацыянальнага падыходу. Этапы рацыянальнага рашэння.

Патрабаванні да кіраўнічых рашэнняў. Фактары эфектыўнасці рашэнняў: трыманне іерархіі, выкарыстанне мэтавых міжфункцыянальных груп, выкарыстанне прамых гарызантальных сувязей, цэнтралізацыя кіраўніцтва. Метады прыняцця кіраўнічых рашэнняў: нефармальныя (эўрыстычныя); экспертныя; колькасныя. Класіфікацыя кіраўнічых рашэнняў па функцыянальным змесце; сферы дзеяння; арганізацыі распрацоўкі; характары мэт і перыядзе дзеяння; іерархіі кіравання; маштабе аб’екта кіравання; ступені дакладнасці інфармацыі; спосабе фіксацыі.

## 21. Механізмы фінансавання арганізацый культуры ў Рэспубліцы Беларусь

Адказнасць дзяржаўных органаў за развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы створаных арганізацый культуры; за выкананне дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартаў у галіне культуры; за ажыццяўленне інфармацыйных, асветных, адукацыйных, выхаваўчых, забаўляльных і іншых функцый некамерцыйнага характару ў галіне культуры (у адпаведнасці з законам аб культуры). Узроўні бюджэтнага фінансавання: нарматыўны (забеспячэнне патрэбнага стану матэрыяльнай базы), змястоўны (для стварэння і рэалізацыі сацыяльна-культурных праектаў і праграм), сацыяльны (ці кампенсацыйны, па каштарысе бягучых выдаткаў). Гаспадарчы разлік (самастойнае пакрыццё бягучых выдаткаў дзяржаўным прадпрыемствам).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Камерцыйны разлік (метад вядзення прыватнага прадпрыемства).

Пазабюджэтная дзейнасць: арганізацыя платных паслуг; прыцягненне і акумуляванне сродкаў з розных крыніц (спонсарства, патранаж і дабрачыннасць). Прынцыпы дзяржаўнага фінансавання сферы культуры.

## 22. Арганізацыя рэкламнай кампаніі ў дзейнасці ўстаноў культуры

Асаблівасці выкарыстання рэкламных сродкаў і носьбітаў у сферы культуры. Рэкламная стратэгія як цэласны, лагічна пабудаваны працэс. Выбар рэкламнай стратэгіі культурна-адпачынкавых мерапрыемстваў.

Распрацоўка рэкламнага звароту сацыякультурнай накіраванасці. Структура рэкламнага звароту (слоган, зачын, інфармацыйны блок, даведачныя даныя, эха-фраза). Методыка складання слоганаў для культурна-адпачынкавых праектаў. Ілюстрацыйныя элементы рэкламнага звароту: таварны знак і лагатып. Этап узгаднення рэкламнага матэрыялу з рэкламадаўцамі.

Рэкламная кампанія як сістэма рэкламных мерапрыемстваў. Мэты правядзення рэкламных кампаній. Разнастайнасць класіфікацый рэкламных кампаній. Паслядоўнасць планавання рэкламнай кампаніі.

## 23. Змест і структура маркетынгу ў сацыякультурнай сферы

Маркетынг як тэорыя і практыка арганізацыі дзелавой актыўнасці на рынку і тэхналогія ўплыву на рыначную сітуацыю. Магчымасці маркетынгу ў развіцці сферы культуры, эфектыўнай дзейнасці яе ўстаноў і арганізацый, паспяховай рэалізацыі канкрэтных праектаў.

Маркетынгавы комплекс: 1) рыначныя сілы: пакупніцкія паводзіны спажыўца; гандлёвыя паводзіны (гандляры оптам і ў розніцу); пазіцыі і паводзіны канкурэнтаў; паводзіны вышэйшага кіраўніцтва; 2) элементы маркетынгу: планаванне прадукту (уключна ўпакоўка і маркіроўка); цэнаўтварэнне; месца (абсталяванне і каналы руху прадукту); прасоўванне (рэклама, каналы збыту, персанальны продаж, сувязі з грамад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скасцю); абслугоўванне; канстатаванне фактаў і іх аналіз. Асаблівасці маркетынгу ў сферы культуры.

## 24. Арт-менеджмент як тэарэтычная аснова прадзюсарскай дзейнасці

Арт-менеджмент як галіна тэарэтычных ведаў і сфера прафесійнай дзейнасці ў сферы мастацтва і культуры, кіраванне працэсам стварэння ўмоў для творчасці – матэрыяльных, арганізацыйных, тэхналагічных, сацыяльна-псіхалагічных, прасоўвання на рынак культурных паслуг вынікаў (прадуктаў) творчай дзейнасці аўтараў і выканаўцаў і арганізацыйных намаганняў калектыву арганізацыі (прадзюсарскага цэнтра, фірмы).

Структура і канцэптуальныя асновы арт-менеджменту. Сусветная арт-індустрыя і спецыфіка арт-рынку ў Беларусі. Прафесійныя функцыі, абавязкі, кампетэнтнастная мадэль спецыяліста і асаблівасці падрыхтоўкі да дзейнасці арт-менеджара. Вопыт падрыхтоўкі арт-менеджараў у іншых краінах свету (ЗША, Заходняй Еўропы і СНД).

## 25. Гульня ў структуры культурна-адпачынкавай дзейнасці

Паняцці «гульня», «гульнявая дзейнасць». Сутнасць і прырода гульні як дасугавай каштоўнасці. Функцыі гульні: выхаваўчая, камунікатыўная, геданістычная, кампенсатарная, функцыя сацыялізацыі і інш.

Класіфікацыя гульняў на падставе інтэлектуальнай і фізічнай нагрузкі на ўдзельнікаў: інтэлектуальныя, гульні-драматызацыі, арыентавана-дзейнасныя, гульні фізічнага развіцця.

Сацыякультурная дынаміка гульні ў дасугавай прасторы: гульнявая форма, гульнявы кампанент, гульнявая праграма.

Гульня ў святочна-абрадавай культуры. Развіццё гульнявой культуры ў Беларусі. Беларускія гульнявыя традыцыі ў сучаснай сацыяльна-культурнай практыцы. Уклад беларускіх навукоўцаў у распрацоўку тэорыі і тэхналогіі гульнявой дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 26. Сутнасць і асаблівасці культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці

Сацыяльная і псіхафізіялагічная сутнасць культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці. Прадмет і аб'ект рэкрэацыйна-анімацыйнай дзейнасці.

Рэкрэацыя як спосаб узнаўлення і аднаўлення сутнасных сіл чалавека: інтэлектуальных, фізічных і эмацыянальных.

Анімацыя як шлях «ажыўлення» і «адухатварэння» міжасабовых і міжгрупавых сацыяльна-псіхалагічных зносін.

Прынцыпы і функцыі арганізацыі рэкрэацыйна-анімацыйнай дзейнасці.

Характарыстыка сістэмы рэкрэацыйна-анімацыйнай дзейнасці: арганізацыя штодзённага адпачынку, адпачынку ў выхадныя дні, святочнага адпачынку, адпачынку па месцы жыхарства, фарміраванне культуры адпачынку.

Педагагічныя задачы: арганізацыя зносін, актывізацыя ўдзельнікаў, стварэнне ўмоў для рэалізацыі асноўных функцый рэкрэацыйнай дзейнасці.

Крытэрыі эфектыўнасці культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці.

## 27. Сутнасць і змест культурна-рэкрэацыйных праграм

Паняцце і класіфікацыя культурна-рэкрэацыйных праграм. Асноўныя віды адпачынку і забаў: зносіны, гульня, аматарства, успрыманне відовішча, заняткі спортам, турызмам, танцамі.

Драматургія і рэжысура разнастайных культурна-рэкрэацыйных праграм.

Міжасабовая камунікацыя як аснова арганізацыі камерных праграм: салоны, вячоркі, творчыя сустрэчы.

Комплексныя рэкрэацыйна-забаўляльныя праграмы як форма масавых зносін: шматпраграмныя вечары адпачынку, дыскатэкі, конкурсна-забаўляльныя праграмы, прэзентацыі, шоу-праграмы, сямейныя дні адпачынку.

Бал, карнавал, «агеньчык» – як спецыфічныя формы адпачынку ў святочныя дні, іх структурныя кампаненты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 28. Сутнасць і змест інфармацыйна-дыскусійнай дзейнасці ў соцыуме

Паняцце «інфармацыйна-адукацыйная дзейнасць». Сацыяльныя функцыі інфармацыйна-адукацыйнай дзейнасці: інфармацыйна-асветніцкая, адукацыйна-развіваючая, выхаваўчая. Інфармацыя, сацыяльная інфармацыя як вядучыя катэгорыі інфармацыйна-адукацыйнай дзейнасці. Класіфікацыя інфармацыі ў залежнасці ад зместу ведаў, па ступені распаўсюджання, па ступені значнасці. Сацыяльная інфармацыя як упарадкаваная разнастайнасць элементаў, сувязей, адносін аб’ектыўнага свету, уключаючы грамадскае жыццё, адлюстраванае суб’ектам. Патрабаванні да зместу інфармацыйна-адукацыйнай дзейнасці.

## 29. Інфармацыйна-дыскусійная дзейнасць як педагагічны працэс

Мэта і задачы інфармацыйна-адукацыйнай дзейнасці (складанне ўмоў для пазнавальнага самаразвіцця асобы, фарміраванне ўменняў і навыкаў самастойнага, навукова абгрунтаванага аналізу з’яў акаляючай рэчаіснасці; паслядоўная мадэрнізацыя агульнаадукацыйнай і прафесійнай падрыхтоўкі, забеспячэнне бесперапыннай адукацыі; фарміраванне грамадскай думкі, актыўнай грамадзянскай пазіцыі і інш.).

Прынцыпы арганізацыі інфармацыйна-адукацыйнай дзейнасці (інтарэсу, актыўнасці, фасілітацыі, адзінства рэкрэацыі і пазнання і інш.). Суб’екты інфармацыйна-адукацыйнай дзейнасці.

## 30. Сродкі, метады і формы інфармацыйна-адукацыйнай дзейнасці

Характарыстыка сродкаў інфармацыйна-адукацыйнай дзейнасці зыходзячы з прынцыпу папулярызацыі навуковых ведаў і шырокага распаўсюджання сацыяльна значнай інфармацыі (навукова-папулярная літаратура, навукова-папулярнае кіно, тэлебачанне, радыё, інтэрнэт і інш.). Метады інфармацыйна-адукацыйнай дзейнасці: метады навучання, метады вучэння, метады кіраўніцтва самастойнай работай чалавека з боку арганізатараў масавай асветы і самаадукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Класіфікацыя арганізацыйных форм (гурткі, школы, курсы, студыі, майстэрні, народныя ўніверсітэты і інш.) у залежнасці ад складу аўдыторыі: масавыя, групавыя, індывідуальныя. Тыпы і віды інфармацыйна-дыскусійных праграм.

## 31. Роля абрадаў і свят у жыцці асобы і грамадства

Месца абрадаў і свят у сістэме выхавання асобы. Паняцці «традыцыя», «звычай», «абрад», «свята» і іх спецыфічныя рысы. Класіфікацыя свят і іх характарыстыка. Групы агульнадзяржаўных, прафесійных, дзіцячых свят. Асноўныя элементы і функцыянальныя напрамкі каляндарнай абраднасці беларусаў.

## 32. Выкарыстанне народных традыцый у сучасных святах зімовага і веснавога цыклаў

Традыцыі і навацыі ў каляндарна-абрадавым свяце «Каляды». Калядныя гульні і іх абрадавы сэнс. Характэрныя асаблівасці каляднага абраду «Шчадраванне», калядныя варожбы. Масленічныя абрады, песні, гульні. Адраджэнне свята «Праводзіны зімы» ў Беларусі, яго структура.

Традыцыйнае і новае ў вясновых святах беларусаў: «Гуканне вясны», «Юр’я», «Зялёныя святкі». Абрады, звязаныя з заклічканнем вясны. Велікодныя абрады і звычаі і іх характарыстыка. Рэгіянальныя асаблівасці вясновых абрадаў і песень.

## 33. Традыцыі і навацыі ў сучасных каляндарных святах летняга і асенняга цыклаў

Агульная характарыстыка сучасных беларускіх свят летнеасенняга цыклаў. Купальскія абрады і павер’і. Традыцыйныя і новыя элементы купальскага свята. Асенні перыяд беларускага земляробчага календара. Агульная характарыстыка свят асенняга цыкла. Аграрная аснова свят «Зажынкі», «Дажынкі», «Багач». Характарыстыка сучаснага фестывалю «Дажынкі».

## 34. Тэхнікі крэатыўнасці ў прафесійнай дзейнасці спецыяліста СКД

Ужыванне крэатыўных методык у сацыякультурнай практыцы і ў крызісных сітуацыях. Агульная характарыстыка трох

разнавіднасцей крэатыўных тэхнік (інтуітыўных, дыскурсіўных і камбінаваных).

Метад асацыяцый. Праграмна-ролевы метад генерыравання ідэй. Тэхніка інавацыі тупіковых сітуацый. Тэхнікі ўяўлення (разумовыя «крэслы» У. Дзіснэя і інш.). Тэхніка кантрольнай табліцы А. Осбарна. Ментальная «правакацыя» Э. дэ Бона. Тэхніка марфалагічнай скрыні Ф. Цвіклі. Тэхніка ТІРП Г. Альтшулера. ТРВЗ.

## 35. Тэарэтычныя асновы сацыяльна-культурнай рэабілітацыі

Рэабілітацыя асобы: мэты, задачы, аб'ект і суб'ект рэабілітацыйнага ўздзеяння. Змест паняццяў «рэабілітацыйная дзейнасць», «сацыяльна-культурная рэабілітацыя», «рэабілітатар», «карэкцыя». Структура ведаў, уменняў і навыкаў у галіне сацыяльна-культурнай рэабілітацыі. Роля дзяржавы, грамадскіх арганізацый у станаўленні і развіцці духоўнай падтрымкі і рэабілітацыі асобы.

Асноўныя патрабаванні да кваліфікацыйных характарыстык педагога-рэабілітатара ў сацыяльна-культурнай сферы. Узаемадзеянне спецыяліста сацыяльна-культурнай дзейнасці з бліжэйшым акружэннем пры ажыццяўленні сацыяльна-культурных рэабілітацыйных мерапрыемстваў.

## 36. Прынцыпы і метады сацыякультурнай рэабілітацыі. Змест сучасных сацыяльна-культурных рэабілітацыйных тэхналогій

Прынцыпы сацыякультурнай рэабілітацыі асобы: сістэмнага, асяродкавага і дыферэнцыраванага падыходаў, прынцып зваротнай сувязі і інш. Змест паняцця «метад». Спецыфіка метадаў і тэхналогій рэабілітацыйнай работы. Метады і тэхналогіі сацыяльна-культурнай рэабілітацыі. Характарыстыка сучасных сацыяльна-культурных рэабілітацыйных тэхналогій: імідж-тэхналогіі, музейная тэрапія, кінатворчасць, цыркавыя тэхналогіі, рэкламныя тэхналогіі, тэхнічная творчасць і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 37. Арт-тэрапеўтычныя тэхналогіі ў структуры сацыякультурнай рэабілітацыі. Арганізацыя арт-тэрапеўтычнай работы спецыялістам сацыяльна-культурнай дзейнасці

Рэалізацыя лячэбных функцый розных відаў мастацтва ў розныя гістарычныя перыяды. Роля мастацтва ў лячэнні і аднаўленні функцый арганізма. Погляды замежных і айчынных спецыялістаў на лячэбна-карэкцыйнае ўздзеянне мастацтва.

Распрацоўка новых кірункаў ведаў, заснаваных на сінтэзе медыцыны, педагогікі, псіхалогіі, мастацтва (лячэбная педагогіка, педагагічная псіхалогія, арт-педагогіка, тэрапія мастацтвам і інш.). Тэрміналагічнае поле арт-тэрапіі і яе месца ў структуры сацыякультурнай рэабілітацыі (мэты і задачы арт-тэрапіі, асаблівасці правядзення арт-тэрапеўтычных заняткаў).

## 38. Тэарэтычныя асновы сацыяльна-культурнага праектавання

Паняцце «сацыякультурнае праектаванне». Аб’ект і суб’ект праектнай дзейнасці. Прынцыпы сацыякультурнага праектавання. Сацыяльна-культурная сфера як аб’ект праектавання.

Сацыяльна-культурнае праектаванне як разнавіднасць прагнастычнай дзейнасці. Суадносіны праектавання з паняццямі «прагназаванне», «праграміраванне», «мадэляванне» і «планаванне». Праблемны падыход да сацыякультурнага праектавання. Класіфікацыя сацыякультурных праектаў па змястоўнай, функцыянальнай і сацыяльна-дэмаграфічнай прыкметах. Узаемасувязь сацыякультурнага праектавання і культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

## 39. Тэхналогія і арганізацыя праектнай дзейнасці

Паняцце «тэхналогіі сацыяльна-культурнага праектавання». Сацыялагічная база як неабходная ўмова забеспячэння асноўных патрабаванняў да сацыякультурных праектаў.

Этапы распрацоўкі і рэалізацыі праектаў. Маркетынг рынку сацыякультурных паслуг. Прамоўтэрская дзейнасць у сацыякультурным праектаванні. Узаемадзеянне і міжсуб’ектныя адносіны сацыяльных партнёраў у працэсе распрацоўкі сацыяльнага заказу. Пошук і абмеркаванне магчымых варыянтаў рэалі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зацыі праектных ідэй і праектных рашэнняў у сацыякультурнай сферы. Пошук і рэалізацыя рэальных крыніц бюджэтнага і пазабюджэтнага фінансавання сацыякультурных праектаў. Прэзентацыя сацыякультурнага праекта.

### 40. Сутнасць і асноўныя прынцыпы эколага-культурнай дзейнасці

Сацыякультурныя высновы станаўлення экалагічнай культуры насельніцтва. Выяўленне спецыфікі і месца экалагічнай культуры ў структуры культуры ў цэлым. Экалагічная культура як аб’ект сацыяльна-педагагічных і сацыякультурных даследаванняў. Структурна-змястоўны аналіз эколага-культурнай дзейнасці.

### 41. Роля нацыянальнага кампанента ў змесце эколага-культурнай дзейнасці

Славянскія традыцыі прыродакарыстання. Асаблівасці земляробчага календара беларусаў і яго ўплыў на развіццё ўзаемаадносін чалавека і прыроды. Тэма прыроды ў беларускай святочна-абрадавай дзейнасці, музычна-песеннай творчасці, народных казках і легендах, прыкладах малога размоўнага жанру (прыказках, прымаўках, загадках). Сучасная практыка выкарыстання багаццяў жыватворнай вусна-паэтычнай спадчыны ў эколага-культурнай дзейнасці.

### 42. Спецыфічныя асаблівасці драматургіі культурна-адпачынкавых праграм

Паняцці «драма», «драматургія», сутнасныя прыкметы драматургіі. Агульнае і спецыфічнае ў драматургіі культурна-адпачынкавых праграм. Кампазіцыйная пабудова дзеяння: экспазіцыя, завязка, развіццё дзеяння, кульмінацыя, развязка, фінал.

Асноўныя метады драматургічнай арганізацыі зместу культурна-адпачынкавых праграм: гульні, ілюстрацыі, тэатралізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 43. Тэхналогія распрацоўкі і стварэння сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы

Сцэнарый як сюжэтна-вобразная канцэпцыя культурна-адпачынкавай праграмы. Віды сцэнарыяў: арыгінальны, кампілятыўны, змешаны.

Этапы работы над сцэнарыем: распрацоўка ідэйна-тэматычнай задумы; вызначэнне формы і зместу праграмы; функцыянальная характарыстыка структурных кампанентаў сцэнарыя (блок, эпізод, карціна, дзеянне, номер).

Вывучэнне і адбор сродкаў выразнасці. Змест як інтэлектуальны кампанент праграмы.

Мантаж як метад мастацка-творчага абагульнення і арганізацыі сцэнарнага матэрыялу. Функцыі і прыёмы мантажу. Літаратурны запіс сцэнарыя і яго афармленне.

## 44. Характарыстыка мастацка-выразных сродкаў эмацыянальна-вобразнага ўздзеяння пры рабоце над сцэнарыем

Спалучэнне «фактаў жыцця» і «фактаў мастацтва» як рацыянальна-лагічнае рашэнне сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы.

Дакументальныя сродкі выразнасці як спосаб рацыянальна-лагічнага рашэння праграмы. Выкарыстанне мясцовага матэрыялу і выбар рэальнага героя для раскрыцця «фактаў жыцця». Прынцыпы адбору дакументальнага матэрыялу.

Мастацкія сродкі выразнасці як эмацыянальна-вобразная аснова сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы. Метады актывізацыі аўдыторыі.

Выкарыстанне ілюстрацыі і інсцэніравання. Метад тэатралізацыі ў стварэнні мастацка-вобразнага рашэння сцэнарыя праграмы.

## 45. Асаблівасці рэжысуры культурна-дасугавых праграм і тэатралізаваных прадстаўленняў

Асноўныя прынцыпы тэатральнай дзейнасці і іх выкарыстанне ў рэжысуры КДП і тэатралізаваных прадстаўленняў. Рэжысёрскія прафесійныя здольнасці. Асаблівасці рэжысуры культурна-дасугавых праграм і тэатралізаваных прадстаўлен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

няў. Разнастайнасць метадаў і выразных сродкаў у рэжысуры культурна-дасугавых праграм і тэатралізаваных прадстаўленняў.

У. І. Неміровіч-Данчанка аб функцыях рэжысёра: рэжысёр-тлумачальнік, рэжысёр-педагог, рэжысёр-арганізатар творчага працэсу. Сістэма К. С. Станіслаўскага як школа выхавання акцёра і рэжысёра, як аснова рэжысуры культурна-дасугавых праграм і тэатралізаваных прадстаўленняў.

### 46. Асаблівасці работы рэжысёра над нумарам культурна-адпачынкавай праграмы і тэатралізаванага прадстаўлення

Сцэнарная распрацоўка нумара як самастойная форма сцэнічнай ідэі. Месца і роля нумара ў КАП і тэатралізаваным прадстаўленні.

Асаблівасці работы рэжысёра над нумарам на аснове літаратурнага твора. Крытэрыі адбору мастацкага матэрыялу для інсцэніроўкі нумара.

Агульныя прынцыпы і законы інсцэніравання. Тэатралізацыя як галоўны метад у рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм.

Методыка арганізацыі калектыўна-індывідуальнай творчасці ў рабоце рэжысёра з выканаўцамі культурна-адпачынкавых праграм і тэатралізаваных прадстаўленняў.

### 47. Падбор мастацка-музычных і мультымедыйных сродкаў у творчым працэсе падрыхтоўкі культурна-адпачынкавай праграмы

Функцыі музычнага мастацтва ў культурна-адпачынкавых праграмах.

Падбор музыкі і мастацкага афармлення ў адпаведнасці са звышзадачай і скразным дзеяннем культурна-адпачынкавай праграмы. Суадносіны драматургіі сцэнічнага дзеяння і стылістыкі музычнай і выяўленчай мовы. Адзінства і канфлікт сцэнічных і мастацка-музычных вобразаў. Падбор і выкарыстанне існуючых мультымедыйных сродкаў; стварэнне новых мультымедыйных прадуктаў і праектаў у межах культурна-адпачынкавых праграм. Хронаметраж сцэнічнага дзеяння і мультымедыйнага суправаджэння ў праграме.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 48. Тэорыя і практыка сувязей з грамадскасцю Public Relations і сумежныя сферы дзейнасці

Паняцце «сувязі з грамадскасцю». Гістарычныя перадумовы і прычыны развіцця сувязей з грамадскасцю. Асноўныя падыходы да трактоўкі паняцця «паблік рылейшнз»: альтруістычны, кампрамісны, прагматычны. Т. Баратон і яго даклад аб трактоўках PR. «Public Relations» як сумленная арганізацыя камунікацыі. Прынцыпы сувязей з грамадскасцю як стратэгічныя нормы пабудовы ўзаемадзеяння паміж удзельнікамі камунікацыйнага працэсу. Асноўная мэта і задачы PR. Састаўныя часткі PR.

## 48. Сувязь Public Relations з грамадскімі зносінамі і асноўнымі відамі прафесійнай дзейнасці

Паняцце «палітычны PR». Сувязі з грамадскасцю ў дзяржаўных структурах («дзяржаўны PR»). Поспех у бізнесе і камерцыйны PR. Развіццё сувязі з грамадскасцю («прамысловы PR»). Сувязі з грамадскасцю ў культурна-забаўляльнай сферы і ў спорце. Тэндэнцыі развіцця сувязей з грамадскасцю ў сацыяльнай сферы. Разнавіднасці PR-тэкстаў і іх жанравая структура.

## 50. Аматарская творчасць як сацыяльна-педагагічная з’ява. Асноўныя прыкметы і віды сучасных аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах

Сучасныя формы сумеснай дзейнасці групы людзей, заснаваныя на агульнасці інтарэсаў, творчым працэсе па засваенні тэарэтычных асноў альбо набыцці навыкаў у пэўных відах дзейнасці альбо мастацтваў. Паняцце і асноўныя прыкметы аматарскіх аб’яднанняў. Класіфікацыя аб’яднанняў аматараў і клубаў па інтарэсах. Аматарская творчасць у мастацкіх калектывах і клубах па інтарэсах як сродак зносін, прапаганды дасягненняў айчыннай і сусветнай культуры, фарміравання светапогляду, выхавання густу, навыкаў самакіравання і самаадукацыі, развіцця ініцыятывы і прадпрымальнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 51. Асаблівасці арганізацыі вучэбна-выхаваўчага і творчага працэсу ў аб'яднаннях аматарскай мастацкай творчасці

Аматарскія мастацкія калектывы як грамадска-культурныя аб'яднанні аматараў музычнага, харэаграфічнага, тэатральнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога і іншых відаў мастацтва. Сацыяльна-педагагічныя ўмовы функцыянавання аматарскіх мастацкіх калектываў і калектыўнай дзейнасці ў сферы аматарскай мастацкай творчасці. Планаванне і арганізацыя вучэбна-выхаваўчага і творчага працэсу ў аб'яднаннях аматарскай мастацкай творчасці. Роля кіраўніка аматарскага калектыву як суб'екта сацыяльна-педагагічнай дзейнасці. Асноўныя адрозненні ў арганізацыі і педагагічным кіраўніцтве дзіцячым аматарскім аб'яднаннем, творчым калектывам і гуртком.

## 52. Сацыяльна-культурная сутнасць, функцыі і класіфікацыя турызму

Тэарэтычныя канцэпцыі турызму (сацыяльна-эканамічная, культуралагічная, сацыяльна-педагагічная і інш.). Статыстычнае вызначэнне паняцця «турызм». Сутнасныя рысы турызму: маторнасць, выезд за мяжу асяроддзя звычайнай жыццядзейнасці, часовы характар падарожжа, мэты падарожжа. Сацыяльныя функцыі турызму: рэкрэацыйна-аздараўленчая, развіваючая, сацыяльна-статусная, інтэграцыйная.

Класіфікацыя турызму як дзяленне на тыпы, катэгорыі, віды і формы, практычныя задачы класіфікацыі турызму.

## 53. Гісторыка-культурная спадчына і прыродны патэнцыял Беларусі і іх выкарыстанне ў мэтах турызму

Паняцце «гісторыка-культурная спадчына». Заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне захавання гісторыка-культурнай спадчыны. Культурна-гістарычныя турысцкія рэсурсы. Размяшчэнне помнікаў гісторыі і культуры ў рэспубліцы, гісторыка-культурныя турыстычныя зоны.

Прыродная спадчына: прыродныя помнікі, геалагічныя і фізіяграфічныя стварэнні, прыродныя славутыя мясціны. Выкарыстанне прыродных рэсурсаў у мэтах турызму. Прыродны турысцкі патэнцыял Рэспублікі Беларусь (нацыянальныя паркі,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ахоўныя тэрыторыі, запаведнікі, прыродныя зоны). Белавежская Пушча як прыродны помнік ЮНЕСКА. Турызм і экалогія.

## 54. Сістэма санаторна-курортных, аздараўленчых і спартыўных устаноў у Рэспубліцы Беларусь

Станаўленне і развіццё сістэмы санаторна-курортных і аздараўленчых устаноў. Характарыстыка ўстаноў: санаторыі, пансіянаты з лячэннем, санаторыі-прафілакторыі, дамы адпачынку, пансіянаты, базы адпачынку, гасцініцы і іншыя сродкі размяшчэння (матэль, кемпінг), дзіцячыя рэабілітацыйна-аздараўленчыя цэнтры, турбазы. Спартыўныя збудаванні (стадыёны з трыбунамі, спартыўныя збудаванні са штучным ільдом, стралковыя ціры, спартыўныя залы, плавальныя басейны). Спартыўна-культурныя комплексы. Спецыфіка арганізацыі культурна-адпачынкавай дзейнасці ў дадзеных установах.

## 55. Спецыфіка вядзення культурна-адпачынкавых праграм

Моўнае дзеянне – асноўны мастацка-выразны сродак вядучага культурна-адпачынкавай праграмы. Віды моўнага дзеяння: забаўляльнае, інфармацыйнае, натхняючае, пераконваючае, заклікальнае. Кампазіцыйная пабудова мовы вядучага. Інфармацыйная культура вядучага.

Функцыі жывога слова. Вербальныя (моўныя) зносіны, невербальныя (немоўныя) зносіны, іх дзейснасць.

Функцыянальныя стылі вядучага: размоўны, навуковы, афіцыйна-дзелавы, публіцыстычны, літаратурна-мастацкі. Вядучы – шоумен, дыджэй, ЭМСІ, ток-шоу, інфармацыйна-дыскусійных, забаўляльных і іншых праграм.

Камунікатыўныя праграмы і асаблівасці іх вядзення (салоны, гасцёўні, вячоркі, вечары-сустрэчы, «агеньчыкі»).

Спосабы эфектыўнага ўздзеяння на аўдыторыю. Мастацтва імправізацыі, асноўныя формы моўных імправізацый, этапы імправізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 56. Сучасная мадэль вядучага культурна-адпачынкавых праграм

Тыпалогія вядучых у залежнасці ад моўнай дзейнасці, формы праграмы, характару дзейнасці. Функцыі вядучага культурна-адпачынкавых праграм: творчая, каментатарская, рэкрэацыйная, арганізатарская, канструктыўная, самаразвіцця, самапрэзентацыі.

Мастацкае мысленне як аснова творчай дзейнасці аўтара праграмы.

Асобасна-прафесійны комплекс якасцей вядучага культурна-адпачынкавых праграм.

Вядучы – сцэнарыст, рэжысёр і арганізатар аўтарскай праграмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

### *Асноўная*


*1. Ариарский, М. А.* Социокультурная деятельность как предмет научного осмысления / М. А. Ариарский. – СПб. : Арт-студия «Концерт», 2008. – 791 с.

*2. Бирюкова, Т. П.* Особенности сценария культурно-досуговых программ / Т. П. Бирюкова // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2008. – № 7. – С. 35–39.

*3. Воловик, А. Ф.* Педагогика досуга : учебник / А. Ф. Воловик, В. А. Воловик. – М. : Флинта, 1998. – 240 с.

*4.* Воспитание личности в социокультурном пространстве. – Минск : Четыре четверти, 2007. – 228 с.

*5. Генкин, Д. М.* Сценарное мастерство культпросветработника / Д. М. Генкин, А. А. Кононович. – М. : Сов. Россия, 1984. – 136 с.

*6. Грыгаровіч, Я. Д.* Прыкладная культуралогія : вучэб. дапам. / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2005. – С. 9–11, 183–212.

*7. Гуд, П. А.* Тэхналогія стварэння свята / П. А. Гуд. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 223 с.

*8. Дуликов, В. З.* Социально-культурная работа за рубежом: тенденции развития : учеб. пособие / В. З. Дуликов. – М. : МГУКИ, 2003. – 115 с.

*9. Жарков, А. Д.* Теория, методика и организация социально-культурной деятельности : учебник / А. Д. Жарков. – М. : МГУКИ, 2012. – 456 с.

*10. Жарков, А. Д.* Теория и технология культурно-досуговой деятельности : учебник / А. Д. Жарков. – М. : Изд. дом МГУКИ, 2007. – 480 с.

*11. Козловская, Л. И.* Досуговая программа в системе социокультурной деятельности / Л. И. Козловская // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2002. – № 3. – С. 15–18.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12. Козловская, Л. И.* Игра в социокультурной сфере / Л. И. Козловская // Социокультурная деятельность как средство воспитания личности. – Минск : Выш. шк., 2004. – С. 38–46.

*13. Крук, Я.* Следам за сонцам: Беларускі народны каляндар / Я. Крук. – Мінск : Полымя, 1998. – 213 с.

*14. Курбатов, В. И.* Социальное проектирование : учеб. пособие / В. И. Курбатов, О. В. Курбатова. – М. : Феникс, 2001. – 416 с.

*15. Киселева, Т. Г.* Социально-культурная деятельность : учебник / Т. Г. Киселева, Ю. Д. Красильников. – М. : МГУКИ, 2004. – 539 с.

*16.* Культурно-досуговая деятельность : учебник / под науч. ред. А. Д. Жаркова, В. М. Чижикова. – М. : МГУК, 1998. – 461 с.

*17. Макарова, Е. А.* Теория социально-культурной деятельности как область научного познания / Е. А. Макарова // Культура. Наука. Творчество : материалы VI Междунар. науч.-практ. конф., Минск, БГУКИ, май 2012 г. – С. 299–304.

*18. Макарава, А. А.* Аматарская мастацкая творчасць / А. А. Макарава // Культура Беларусі: 20 год развіцця (1991–2011) : манагр. / навук. рэд. І. І. Крук. – Мінск : Ін-т культуры Беларусі, 2012. – С. 204–217.

*19. Малахова, И. А.* Развитие креативности личности в социокультурной сфере: пед. аспект / И. А. Малахова. – Минск : БГУКИ, 2006. – 327 с.

*20. Марков, О. И.* Сценарно-режиссерские основы художественно-педагогической деятельности клуба / О. И. Марков. – М. : Просвещение, 1988. – 158 с.

*21. Мойсейчук, С. Б.* Режиссура культурно-досуговых программ : учеб.-метод. пособие для студентов вузов по направлению специальности 1-21 04 01-02 Культурология (прикладная) / С. Б. Мойсейчук. – Минск : [б. и.], 2012. – 98 с.

*22.* Педагогика ненасилия в социокультурной деятельности / В. Н. Наумчик, В. В. Самерсова, Л. И. Козловская [и др.] ; под науч. ред. В. Н. Наумчика. – Минск : Четыре четверти, 2009. – 264 с.

*23.* Рэабілітацыя насельніцтва мастацтвам : вучэб. дапам. / С. У. Аўдзей, Л. І. Казлоўская, А. І. Смолік ; пад рэд. А. І. Смо-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ліка [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры, 1999. – С. 10–35, 119–167.

24. *Самерсова, Н. В.* Экологическая культура личности: социокультурный аспект / Н. В. Самерсова. – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2011. – 274 с.

25. *Смаргович, И. Л.* Основы культурно-досуговой деятельности : учеб.-метод. пособие / И. Л. Смаргович ; М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2013. – 174 с.

26. Социокультурная деятельность как средство воспитания личности : учеб. пособие / под общ. ред. В. Н. Наумчика. – Минск : Выш. шк., 2004. – 165 с.

27. Социокультурная деятельность как средство воспитания личности : пособие для соц. педагогов и рук. учреждений образования / В. Н. Наумчик, Я. Д. Григорович, Н. В. Самерсова [и др.] ; под общ. ред. В. Н. Наумчика. – Минск : Выш. шк., 2004. –134 с.

28. Социальная педагогика. Проблема инкультурации личности : пособие для соц. педагогов и рук. учреждений образования / В. Н. Наумчик. – Минск : Четыре четверти, 2007. – 208 с. : ил.

29. *Стрельцов, Ю. А.* Культурология досуга : учеб. пособие / Ю. А. Стрельцов. – 2-е изд. – М. : МГУКИ, 2003. – 296 с.

30. Технология социально-культурной деятельности : учеб.-метод. пособие / Л. И. Козловская [и др.] ; М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2014. – 206 с.

31. *Тихоновская, Г. С.* Сценарно-режиссерские технологии создания культурно-досуговых программ : моногр. / Г. С. Тихоновская. – М. : Изд. дом МГУКИ, 2010. – 362 с.

32. *Черняк, Ю. М.* Образный строй праздника и зрелища / Ю. М. Черняк. – Минск : ТетраСистемс, 2003. – С. 3–148.

33. *Ярошенко, Н. Н.* Социально-культурная анимация : учеб. пособие / Н. Н. Ярошенко ; Моск. гос. ун-т культуры и искусств. – 2-е изд., испр. и доп. – М., 2005. – 126 с.

34. *Ярошенко, Н. Н.* История и методология теории социально-культурной деятельности : учебник / Н. Н. Ярошенко. – М. : МГУКИ, 2007. – 360 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

*1.* Атлас социально-культурных реабилитационных технологий / сост. Ю. С. Моздокова. – М. : МГУКИ, 2002. – 132 с.

*2. Бакланова, Н. К.* Профессиональное мастерство работника культуры : учеб. пособие / Н. К. Бакланова. – М. : МГИК, 1996. – 120 с.

*3. Новаторов, В. Е.* Культурно-досуговая деятельность : словарь-справочник / В. Е. Новаторов. – Омск : Алтайский гос. ун-т культуры, 1992. – 182 с.

*4. Рябова, Е. В.* Патриотическое воспитание подростков в туристско-экскурсионной работе / Е. В. Рябова // Соц.-пед. работа. – 2008. – № 7. – С. 48–52.

*5.Савина, В. Ф.* Инкультурация средствами коллективно-индивидуального творчества: моделирование учебного процесса подготовки социальных педагогов – организаторов культурного досуга / В. Ф. Савина // Социальная педагогика: проблема инкультурации личности / под общ. ред. В. Н. Наумчика. – Минск : Четыре четверти, 2007. – С. 119–123.

*6. Самерсова, Н. В.* Социокультурная деятельность в контексте решения социально-экологических проблем / Н. В. Самерсова // Социокультурная деятельность как средство воспитания личности : пособие для соц. педагогов и рук. учреждений образования / В. Н. Наумчик, Я. Д. Григорович, Н. В. Самерсова [и др.] ; под общ. ред. В. Н. Наумчика. – Минск : Выш. шк., 2004. – С. 28–38.

*7. Шубина, И. Б.* Организация досуга и шоу-программ / И. Б. Шубина. – Ростов н/Д : Феникс, 2003. – 350 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ**

*Праграма дзяржаўнага экзамену*
*па спецыяльнасці 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*


Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2018. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,81. Ул.-выд. арк. 1,27. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ